3. Епископ Порфирий (Успенский). Святыни земли Италийской. М., 1996.
4. Святой Ефрем Сирианин. Общие уроки о подвижнической жизни / Добротолюбие. - М.,1993. Т.4.
5. Жураўскі, А. І. Царкоўнаславянская мова ў старажытнай Беларусі / А.І. Жураускі. // Тэзісы навуковай канферэнцыі, прысвечанай
1000-годдзю Полацкай епархіі і Праваслаўнай царквы на Беларусі. Мінск., 1992.
6. Полоцкий летописец / Историко-архитектурный журнал - Полоцк, 1992.
7. Изречения Евагрия Монаха о духовной жизни. / Добротолюбие. - М., 1993. Т.2.
8. Кудрявцева, Т. Русское церковное прикладное искусство / Т. К. Удрявцева./ К Свету, 1993. №17.
9. Максим Исповедник «Мистагогии» / Настольная книга священнослужителя. - М. 1983. Т.4.
10. Мельников, А. А. Преподобная Евфросиния Полоцкая / А.А. Мельников. - Минск, 1997.
11. Писания св. отцов и учителей Церкви, относящиеся к истолкованию православного богослужения. - СПб,. 1855. Т.1.
12. Подвижнические наставления Святого Исаака Сирианина // Добротолюбие. - М., 1993, Т.4.
13. Стерлигова, И. А. Иерусалимы как литургические сосуды в Древней Руси / И.А. Стерлигова //Иерусалим в русской культуре. – М., 1994.
14. Хозеров, И. М. К исследованию конструкции Спасского храма в Полоцке / И. М. Хозеров. - Смоленск, 1928.

***Венідзіктаў С.В., Наздрын-Платніцкая А.І.* Сучасны стан традыцыйных і нетрадыцыйных рэлігійных напрамкаў у Рэспубліцы Беларусь**

За апошнія два дзесяцігоддзі значэнне рэлігіі ў Беларусі істотна ўзрасло. Доля праваслаўных цалкам карэспандуе з доляй прадстаўнікоў славянскіх этнасаў у складзе насельніцтва Рэспублікі Беларусь, а доля мусульман – з прадстаўніцтвам цюркскіх і каўказскіх этнічных груп.

Зараз вернікі больш ці менш раўнамерна размеркаваны ва ўсіх групах насельніцтва па ўзросту, адукацыі, занятасці. У сучасным беларускім грамадстве рэлігійнасць страціла характар маргінальнасці пэўных грамадскіх груп, а стала духоўнай якасцю, уласцівай у прыкладна роўнай ступені ўсім групам насельніцтва, у тым ліку і найбольш маладым, адукаваным, прафесійна кваліфікаваным і сацыяльна актыўным.

Як правіла, калі жыхары Беларусі заяўляюць аб сваёй прыналежнасці да той ці іншай рэлігійнай канфесіі, гаворка ідзе не аб рэлігійнай, а, хутчэй, аб культурнай ідэнтыфікацыі. Лічыцца, што праваслаўе – "традыцыйная рэлігія ўсходніх славян". Хрышчэнне дзіцяці ў праваслаўным храме ўспрымаецца як традыцыйны рытуал, тое ж адносіцца і да адпяванне памерлых. Гэтыя два хрысціянскія сакрамэнты з'яўляюцца на Беларусі найбольш масавымі.

Больш чым у паловы прыхільнікаў рэлігіі рэлігійныя ўяўленні аказваюцца размытымі, аморфнымі, слаба звязанымі з дактрынальнамі палажэннямі канкрэтнай канфесіі. Гэта дазваляе зрабіць выснову аб тым, што рэальны ўзровень рэлігійнасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь значна ніжэйшы за заяўлены.

Варта таксама ўлічваць, што за гады савецкай улады ў большасці людзей было згублена само разуменне таго, што такое рэлігія. Яна зводзілася, па-першае, да выканання традыцыйных абрадаў (як прыклад: амаль 100 % насельніцтва "хрысціянскіх тэрыторый" і пры камуністах святкавала Вялікдзень) і, па-другое, да сродку суцяшэння чалавека ў яго бедах. У поўнай адпаведнасці з марксісцкай ідэалогіяй асноўнай функцыяй рэлігіі лічылася ілюзорна-кампенсаторная, і часцяком рэакцыяй на сацыяльныя катаклізмы пачатку 1990-х гадоу з'явіўся зварот да рэлігіі.

Аб'ектыўным паказчыкам змен у рэлігійнай сферы Беларусі з'яўляецца рост колькасці рэлігійных арганізацый. Напрыклад, з 1988 па 2014 гг. колькасць рэлігійных суполак павялічылася больш як у 4 разы, а рэлігійных накірункаў – у 3 разы.

Вядучае месца ў рэлігійным жыцці краіны займае Беларуская праваслаўная царква, якая аб'ядноўвае 1545 прыходаў, 11 дыяцэзій, 5 духоўных навучальных установаў, 32 манастыры, 14 брацтваў, 10 сястрыцтваў. Дзейнічаюць 1334 праваслаўныя храмы, каля 150 будуюцца. У парафіях працуе 1577 святароў.

Рымска-каталіцкая царква аб'ядноўвае чатыры епархіі, якія налічваюць 475 абшчын. У Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць 3 духоўныя навучальныя ўстановы, 9 місій Рымска-каталіцкай царквы. Абшчыны маюць 464 касцёлы, 26 будуюцца. У прыходах працуе 418 святароў.

Пратэстанцкія рэлігійныя арганізацыі прадстаўленыя 1005 рэлігійнымі суполкамі, 21 аб'яднаннем, 22 місіямі і 5 духоўнымі навучальнымі ўстановамі 14 рэлігійных напрамкаў. Найбольш буйнымі з'яўляюцца хрысціяне веры евангельскай: пяцідзесятнікі (505 абшчын), евангельскія хрысціяне баптысты (275 абшчын), адвентысты сёмага дня (72 абшчыны). Гістарычна традыцыйным на тэрыторыі рэспублікі з'яўляецца лютэранства, якое ў цяперашні час прадстаўлена 27 суполкамі.

У Беларусі зарэгістраваны 32 рэлігійныя абшчыны старавераў, у распараджэнні вернікаў маецца 27 культавых будынкаў.

Іўдаізм прадстаўлены 52 суполкамі, якія адносяцца да трох напрамкаў (артадаксальны, хесэд-любавіч, прагрэсіўны). Зарэгістравана 3 рэлігійныя аб'яднанні. У распараджэнні абшчын маецца 7 культавых будынкаў, 4 будынкі знаходзяцца ў стане рэканструкцыі.

Іслам прадстаўлены 25 суполкамі, у тым ліку 24 суніцкага напрамку і 1 шыіцкага. Зарэгістравана 2 рэлігійныя аб'яднанні. Дзейнічаюць 5 культавых будынкаў, вядзецца будаўніцтва мячэці ў Мінску. Акрамя таго, у Беларусі зарэгістраваны прыходы грэка-каталіцкай, армянскай апостальскай цэркваў і інш.

Ажыўленне рэлігійнага жыцця ў Беларусі ў 1990 гадах прывяло да з'яўлення груп паслядоўнікаў новых рэлігій, чаму спрыяла актыўная місіянерская дзейнасць іх функцыянераў. Зараз у Беларусі прадстаўлены Міжнароднае таварыства Свядомасці Крышны, Вера Баха, Сусветны Духоўны Універсітэт Брахма Кумарыс, Царква Аб'яднання, Царква саенталогіі, Сахаджа-ёга і іншыя кірункі. Некаторы ўплыў маюць Царква Апошняга Запавету, паслядоўнікі вучэння Парфірыя Іванова, неапаганскія групы. Пэўная цікавасць праяўляецца да тэасоўскага і антрапасоўскага вучэнняў, "Жывой этыцы" і Агніёзе Рэрыхаў.

У сярэдзіне 2013 года ў Беларусі налічвалася і было дакументальна зафіксавана дзейнасць 398 арганізацый, якія адносяцца да новых рэлігійных рухаў. З іх 101 арганізацыя

ўпісваецца ў такія катэгорыі, як культавы рух, секта, культ. Таксама ў краіне дзейнічае 297 кліентурных культаў.

З усіх НРР афіцыйна зарэгістраваныя ў Беларусі як рэлігійныя арганізацыі толькі 13. На тэрыторыі краіны новыя рэлігійныя рухі распаўсюджваюць 421 перыядычнае выданне, 96 з якіх выпускаюцца ў Беларусі.

На сучасным этапе ў Беларусі, па дадзеных Дзяржкамітэта па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь, існуе таксама 11 арганізацый, дзейнасць якіх прызнана дэструктыўнай і супярэчыць законам Рэспублікі Беларусь. Арганізацыі, дзейнасць якіх супярэчыць законам Рэспублікі Беларусь: "Вялікае Белае брацтва" ("Юсмалос"); "Дзеці Бога" або "Сям'я"; "Царква аб'яднання" або "Царква Муна", сайенталагічная царква; "Аум Сінрікё"; "Царква вучняў Ісуса Хрыста"; "Багароднічы цэнтр"; "Царква Вісарыён"; "Ліга духоўнага адраджэння Санатана Дхарма"; "Ахмад"; "Сатаністы".

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь рэгламентуе адказнасць за парушэнне прававых норм аб свабодзе сумлення, веравызнання і рэлігійных арганізацыях. Прадугледжана адказнасць за парушэнні, якія выявіліся ў стварэнні і дзейнасці рэлігійных арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, накіраванай супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды ці звязанай з парушэннем правоў і свабод грамадзян. Таксама адказнасць прадугледжана за дзейнасць, якая накіравана супраць выканання грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў або наносіць шкоду іх здароўю і маральнасці. Падлягае адказнасці таксама стварэнне рэлігійных арганізацый у дзяржаўных органах і ўстановах, воінскіх частках, адукацыйных установах; уцягванне непаўнагадовых у рэлігійныя арганізацыі, навучанне непаўнагадовых рэлігіі насуперак іх волі і без згоды іх бацькоў ці асоб, што іх замяняюць; апаганьванне шануемых у рэлігіі прадметаў, культавых збудаванняў, месцаў паломніцтва і пахаванняў; парушэнне таямніцы споведзі; узбуджэнне рэлігійнай варожасці альбо абраза грамадзян у сувязі з іх рэлігійнымі перакананнямі. Службовыя асобы і грамадзяне, вінаватыя ў дадзеных парушэннях, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, Крымінальны кодэкс прадугледжвае адказнасць за парушэнне раўнапраўя

грамадзян у залежнасці ад стаўлення да рэлігіі і перакананняў (арт. 190 – штраф або папраўчыя работы на тэрмін да двух гадоў, або абмежаванне волі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення), за арганізацыю альбо кіраўніцтва рэлігійным аб’яднаннем, дзейнасць якога звязана з гвалтам над грамадзянамі, або з іншымі замахамі на іх правы, свабоды і законныя інтарэсы (арт. 193 – арышт альбо пазбаўленне волі на тэрмін да двух гадоў) і інш.

У цэлым для Беларусі характэрна мірнае суіснаванне прадстаўнікоў розных канфесій, а таксама наяўнасць міжрэлігійнага дыялогу. Да нядаўняга часу яго асноўным ініцыятарам была Беларуская праваслаўная царква. На ўзроўні рэспубліканскага кіраўніцтва былі ўсталяваныя добрыя адносіны паміж праваслаўнымі і каталікамі, ажыццяўлялася ўзаемадзеянне з евангельскімі хрысціянамі-баптыстамі. Па ініцыятыве Беларускай праваслаўнай царквы былі праведзены тры міжнародныя канферэнцыі, прысвечаныя міжрэлігійнаму дыялогу: “Дыялог хрысціян і мусульман ва ўмовах глабалізацыі” (2007), “Хрысціянска-іудзейскі дыялог: хрысціянскія каштоўнасці як аснова ўзаемапавагі ў грамадзянскай супольнасці” (2009), “Праваслаўна-каталіцкі дыялог: хрысціянскія этычныя каштоўнасці як уклад у сацыяльнае жыццё Еўропы”(2011).

## *Бровка Г.М.* Социально-экономические вызовы при формировании инновационной экономики

Необходимо отметить, что процесс формирования инновационной экономики не только открывает новые возможности развития для государства, но также подразумевает формирование определенных вызовов и угроз экономической безопасности, требующих заблаговременных и эффективных мер прогнозирования, нейтрализации и предупреждения со стороны государственных органов [1]. Под угрозами экономической безопасности в инновационной сфере следует понимать угрозы успешному протеканию процесса инновационного развития государства. В зависимости от сферы возникновения классификация данных угроз может быть произведена различными